# Раздзел I. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ І КНІЖНАЙ СПРАВЫ БЕЛАРУСІ

***Кузьмініч Таццяна Васільеўна***
Нацыянальная бібліятэка Беларусі

## БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ ГІСТАРЫЧНАГА ПАЗНАННЯ

Беларуская гістарычная бібліяграфія – неад'емная складаючая айчыннай гістарычнай навукі, яе пастаянная і незаменная спадарожніца. Разам з тым яна з'яўляецца галіновым кірункам бібліяграфічнай дзейнасці (бібліяграфіі) – старажытнай грамадскай з'явы, элементы якой узніклі разам са з'яўленнем дакумента (фіксаванага тэксту) (далей тэкст). Адпаведна яе развіццё абумоўлена як тэндэнцыямі, характэрнымі для гістарычнай навукі, так і асаблівасцямі функцыянавання бібліяграфіі. Апошнія вызначаюць яе бібліяграфічную сутнасць і імператыўны характар у сістэме гістарычнага пазнання (сінтэзу гістарычных ведаў). Бібліяграфія ў межах універсуму чалавечых ведаў стварае «спецыяльную (лакальную) навуковую карціну свету тэкставых камунікацый – важнейшага фрагмента рэальнага быцця… [і разам з тым гэта] веды аб крыніцах ведаў, якія дазваляюць іх структурыраваць, арганізоўваць, аперыраваць асобнымі іх фрагментамі» [1]. Яе сродкамі пазнаецца свет тэкставых камунікацый. Вынікам такога (бібліяграфічнага) пазнання з'яўляюцца «аб'ектыўна-сапраўдныя (ісцінныя) гнастычныя вобразы фіксаваных тэкстаў, уяўленне чалавека (грамадства) аб свеце тэкстаў і яго адносінах з гэтым светам» [2].

У сучасных айчынных і замежных гістарычных працах надаецца пільная ўвага даследаванню сутнасці гістарычнага пазнання, структуры гістарычных ведаў, акцэнтуецца ўвага на важнасці міждысцыплінарных даследаванняў, выкарыстання гістарычных крыніц і прымянення матэматычных метадаў даследавання [3]. Падкрэсліваецца яе важнасць для развіцця гістарычнай навукі спецыяльных (дапаможных) гістарычных дысцыплін. У свой час Э. Пітц адзначаў, што «гісторык-практык… не можа адыйсці ад непазбежнага і яснага патрабавання максімальна поўна выкарыстоўваць у сваёй рабоце ўсе навуковыя веды свайго часу. Але… гістарычная навука прапаноўвае яму гэтыя веды ў такой форме, якая непарыўна звязана з праблемай гістарычных структур, а менавіта ў выглядзе веера дапаможных гістарычных дысцыплін… Уяўляецца абсалютна бясспрэчным, што вельмі важнай і істотнай часткай… сучасных гістарычных пазнанняў [гісторыкі] абавязаны менавіта іх метадам» [4]. Пры гэтым ні ў вышэйпрыведзеных працах, ні ў шэрагу іншых не звяртаецца ўвага на бібліяметрычныя метады даследавання, якія шырока выкарыстоўваюцца ў гістарычнай навуцы, на сутнасць бібліяграфічных ведаў, што запатрабаваны і часткова выпрацоўваюцца ёй. Між тым у бібліяграфазнаўстве ў апошнія два дзесяцігоддзі былі ўзноўлены пазіцыі пазнавальнай сутнасці бібліяграфіі як грамадскай з’явы, абгрунтавана когнітаграфічная канцэпцыя яе развіцця (працы расійскага бібліяграфазнаўцы В.А. Факеева). Але ў галіновым бібліяграфазнаўстве (айчынным і замежным) гэта канцэпцыя практычна не атрымала свайго працягу. Разам з тым найбольш выразна яе сутнасць можна праілюстраваць на прыкладзе гістарычнай бібліяграфіі – галіновай бібліяграфічнай сістэмы, звязанай з самай панарамнай грамадскай навукай, якая «разглядае працэс развіцця ў цэлым, усю сукупнасць з’яў грамадскага жыцця, усе бакі і іх ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці» [5]. Спецыфічнасць гістарычнага пазнання заключаецца ў апасродкаванасці гістарычных крыніц, адноснасці вынікаў, што атрымліваюцца, асаблівасцях метадаў навуковага аналізу і да т. п. [6]. У дадзеным артыкуле мы звернем увагу на патэнцыял беларускай гістарычнай бібліяграфіі ў дачыненні гістарычнага пазнання, разгледзім асаблівасці ведаў,

якія яна стварае, іх асноўныя ўзроўні і магчымасці выкарыстання пры правядзенні гістарычных даследаванняў.

Бібліяграфія забяспечвае стварэнне як інфармацыйна-пошукавых сістэм агульнага характару, так і бібліяграфічнай прадукцыі спецыяльнага прызначэння. Веды, якія яна пры гэтым выпрацоўвае, пастаянна выкарыстоўваюцца (пераўтвараюцца) у навуковай сферы, а бібліяграфічная дзейнасць суправаджае развіццё кожнага навуковага кірунку. Менавіта «метрычныя здольнасці» бібліяграфіі дазваляюць назапасіць эмпірычны матэрыял пры выяўленні распрацаванасці той ці іншай праблемы, тэмы, даследаванні станаўлення і развіцця галіны ведаў у цэлым, аналізе асабістага ўнёску вучонага ці навуковага калектыву ў сістэму навуковых ведаў, стварэнні карціны развіцця навукі за пэўны адрэзак часу і да т. п. Беларуская гістарычная бібліяграфія ў гэтым сэнсе таксама выконвае сваю «галіновую» задачу. Але ёй уласціва і асобае прызначэнне, уласнае месца ў шэрагу спецыяльных гістарычных дысцыплін айчыннай гістарычнай навукі. Праз сукупнасць характарыстык беларуская гістарычная бібліяграфія азначае (называе) тэкст як факт гісторыка-культурнага развіцця грамадства, забяспечвае яго адназначную ідэнтыфікацыю і магчымасць пошуку ў любых масівах інфармацыі. Яе сродкамі падагульняецца сукупнасць дакументаў (тэкстаў) па фармальных і змястоўных, колькасных і якасных крытэрыях. У яе межах ствараюцца бібліяграфічныя веды аб гістарычных крыніцах і тэкстах гістарычнага зместу. Пры гэтым гісторыкам прапануюцца як адпаведныя структурыраваныя бібліяграфічныя веды, так і механізмы для самастойнай кагнітыўнай дзейнасці па іх генерыраванні. Гістарычная бібліяграфія, такім чынам, удзельнічае ў працэсах гістарычнага пазнання і з'яўляецца адным са сродкаў захавання гісторыка-культурнай памяці нашага грамадства.

Бібліяграфічныя веды аб тэкстах (сукупнасць характарыстык тэксту, якія неабходны і дастатковы для яго ідэнтыфікацыі) з'яўляюцца іх неад'емнай складаючай і адпаведна часткай гістарычных ведаў. Прычым гэта важна для гістарычнай навукі, незалежна ад дамінуючых канцэпцый яе развіцця. Яны запатрабаваны з пункту гледжання як аналітычнай філасофіі гісторыі, у межах якой «ісцінную сутнасць» гістарычных ведаў імкнуліся прасачыць

праз аналіз структуры і логікі выказванняў, што змяшчаліся ў гістарыяграфічных працах [7], так і для постмадэрнісцкіх філасофскіх поглядаў, дзе дамінуе «тэкставы» кірунак, а сутнасць гістарычных ведаў зводзіцца да таго, што яны прадстаўлены ў форме тэкстаў. З другой паловы 1970-х гг. у гістарычнай навуцы ўзрасла цікавасць да вызначэння паняццяў «структура» і «структурныя метады», праблем метадалагічнага канструявання гістарычных ведаў. Задача даследчыка гісторыі бачылася ва ўпарадкаванні даных і пабудове структур, а найбольш канструктыўнымі для пазнання лічыліся статыстычныя і дынамічныя мадэлі [8]. Па словах М.І. Мініцкага, для сучаснай метадалогіі гісторыі характэрна прымяненне сістэмнага, сінергетычнага і антрапалагічнага падыходаў, парадыгма «парадак – хаос» становіцца стратэгічнай лініяй даследавання, прасочваецца паглыбленне цікавасці да эпістэмалогіі, асноўным пытаннем якой становіцца пабудова і прадстаўленне гістарычных ведаў, сутнасць якіх суадносіцца як з самой гістарычнай рэальнасцю, так і з яе пазнаннем. Пабудова і прадстаўленне гістарычных ведаў, іх інтэрпрэтацыя лічацца базавымі аперацыямі пазнавальнай дзейнасці, а канцэпт «структура і працэсы» займае адно з галоўных месцаў [9]. У некаторых працах паказана значнасць палажэння аб наяўнасці структур і працэсаў, што маюць вялікую працягласць у гісторыі, узаемасувязь з катэгорыямі «ўласцівасць», «адносіны» і «сістэма», а прадмет пазнання фармулюецца як сукупнасць асноўных спецыфічных структур, уключаючы іх элементы і кампаненты. Пазнавальныя структуры набываюць у тэарэтычным мысленні самастойнае існаванне і па сваім змесце адлюстроўваюць як саму гістарычную рэальнасць, так і працэс гістарычнага даследавання [10].

Апошняя складаючая грунтуецца на бібліяграфічным метадзе мадэліравання тэксту (дакумента), любой яго сукупнасці і ўключае бібліяграфічныя схемы як самі па сабе, так і як неад'емную частку іншых уласна тэкставых схем. Бібліяграфічны метад сугучны з матэматычнымі метадамі мадэлявання гістарычных ведаў [11], герменеўтычнымі метадамі [12] і ў сукупнасці з імі дазваляе зрабіць шматмернае мадэляванне гістарычных працэсаў праз масівы ідэнтыфікаваных тэкстаў (пісьмовых гістарычных крыніц і даследаванняў) з рознай ступенню пранікнення ў тэкст і

абагульнення звестак аб ім і з яго. Гістарычная бібліяграфія карыстаецца прыёмамі, характэрнымі для квацітатыўнай гісторыі. У некаторых выпадках яна дае свой выпрацаваны стагоддзямі інструментарый, але ў абавязковым парадку пацвярджае (абазначае, ідэнтыфікуе) крыніцы любых колькасных даных. Гістарычная бібліяграфія ўмацоўвае выснову, што «крытэрыем адэкватнасці выступае здольнасць колькасных метадаў спалучацца з крыніца-арыентаванымі даследаваннямі для вырашэння метадалагічных праблем» [13]. Апошняе ажыццяўляецца і ў межах апавядальнай, наратыўнай гісторыі, таму што пазнавальная дзейнасць гісторыка ўяўляе сабой «элемент цэласнага асваення карціны свету чалавекам з улікам грамадска-практычнай прыроды яго дзейнасці і культурнага кантэкста ў гэтай дзейнасці» [14], а механізм яго «творчасці прадугледжвае рух думкі ад гістарычнай крыніцы, праз вычляненне фактаў, іх збіранне (эмпірычны ўзровень) і шырокае асэнсаванне (тэарэтычны ўзровень)…» [15].

Беларуская гістарычная бібліяграфія суправаджала гістарычную навуку (адпаведна бібліяграфічныя веды – гістарычныя веды) на ўсіх этапах развіцця апошняй праз фарміраванне ад самых простых формаў ідэнтыфікацыі тэкстаў, што ствараюцца і выкарыстоўваюцца, да пабудовы складаных пошукавых сістэм. На сучасным этапе, калі «гістарычная навука ўсё больш абапіраецца не на ідэалагічнае адзінства, а на ўзаемасувязь, узаемапранікненне розных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў [і фарміруецца] гістарычная сінергетыка як новы тып пабудовы навуковых ведаў… [якая] прадугледжвае інтэграцыйныя подступы ў механізме гістарычнага пазнання з іх адмовай ад адзінай метадалогіі, з іх прыхільнасцю да верагоднаснага прагназавання станаў і форм аб’екта даследавання» [16], значнасць і адпаведна патрабаванні да якасці бібліяграфічнага суправаджэння ўзрастаюць. Асабліва калі на тэкст (і крыніцу, і гістарычнае даследаванне) можна распаўсюдзіць сцвярджэнне, што ён належнасць мінулага, ужо не існуючага сусвету, і гэта вызначае «яго ролю гнасеалагічнай патэнцыяльнасці, абгрунтоўвае яго функцыю ў якасці таго, што можа служыць сапраўднай крыніцай ведаў аб мінулым» [17].

Сапраўднасць крыніцы ведаў аб мінулым пры гэтым можа пацвердзіць менавіта гістарычная бібліяграфія, выкарыстоўваючы

свае прыёмы і метады. Але магчымасці гістарычнай бібліяграфіі значна шырэй. Яны заснаваны на некалькіх узроўнях бібліяграфічных ведаў, што ствараюцца. На думку В.А. Факеева, бібліяграфічныя веды маюць наступныя ўзроўні:

1. Апісальны ўзровень (веды асобных бібліяграфічных фактаў, атрыманых у выніку іх генерыравання, адбору, фіксавання, апісання, прадстаўленых у форме бібліяграм – бібліяграфічных запісаў).

2. Тлумачальны ўзровень (інтэрпрэтацыя бібліяграфічных фактаў і іх сукупнасцей, выражаная праз анатацыі, рэфераты, агляды).

3. Класіфікацыйны ўзровень (структураванне масіваў бібліяграм).

4. Веды заканамернасцей развіцця і функцыянавання патокаў дакументаваных тэкстаў у сістэме сацыяльных камунікацый.

5. Веды, якія ствараюцца суб'ектамі бібліяграфічнага пазнання пры прыняцці рашэнняў адносна пэўных тэкстаў (напрыклад, «чытаць – не чытаць», «рэкамендаваць для вывучэння – не рэкамендаваць» і да. т. п.) [18].

Трэба адзначыць, што ў вышэйпрыведзеным пераліку ўзроўняў бібліяграфічных ведаў не названы яшчэ адзін – веды аб асобных (у нашым выпадку гістарычных) аб'ектах з самога тэксту і мадэляванне масіваў гістарычных тэкстаў паводле гэтага аб'екта. Гэта вельмі выразна бачна пры аналізе магчымасцей сучасных бібліятэчных інфармацыйна-пошукавых сістэм (больш падрабязна названы ўзровень будзе паказаны ніжэй).

У межах гістарычнай навукі выкарыстоўваюцца ўсе вышэйпералічаныя ўзроўні бібліяграфічных ведаў, але найбольш істотнымі ўяўляюцца апісальны (можна ўдакладніць – апісальна-ідэнтыфікацыйны), класіфікацыйны і апошні, які ўмоўна можна назваць аб'ектным. Веды, што ствараюцца на гэтых узроўнях, забяспечваюць бібліяграфічнае пазнанне і ідэнтыфікацыю тэксту як аб'екта рэчаіснасці (факта гісторыка-культурнага развіцця грамадства), мадэлююць сукупнасць тэкстаў па любых вызначаных прыметах, даюць колькасныя даныя, паказваюць узаемасувязі паміж асобнымі бібліяграмамі і фрагментамі тэкстаў. Бібліяграма, ці бібліяграфічны запіс, з'яўляецца асноўным спосабам фіксавання бібліяграфічнай інфармацыі і асноўнай адзінкай любога бібліяграфічнага

дапаможніка. Яна ўяўляе сабой набор асобных элементаў тэксту, неабходных як для ідэнтыфікацыі аб'екта апісання, так і для ўстанаўлення неабходных дадатковых характарыстык. Іх фармулёўка найчасцей здзяйсняецца пры рабоце з дакументам de vizu (для каталагізацыі гэта адно з абавязковых патрабаванняў), аб'ектыўна адлюстроўвае тую ці іншую характарыстыку дакумента і адпаведна іх набор – дакумент у цэлым ці яго любую лагічна выдзеленую складаючую. Атрымліваецца своеасаблівая схема ці структурная мадэль ведаў аб тэксце («паэлементныя веды аб дакументным патоку» [19]). Схемы, згодна з шэрагам даследаванняў у семіётыцы і метадалогіі гісторыі, з'яўляюцца асноўнымі пазнавальнымі інструментамі сучасных грамадскіх і гуманітарных дысцыплін, крыніцамі ведаў і сродкамі іх перанясення [20]. Складанасць бібліяграфічных схем (бібліяграм) залежыць ад ступені пранікнення суб'екта пазнання ў тэкст і неабходнасці прадстаўлення побач з неабходнымі і дастатковымі характарыстыкамі дадатковых – фармальных, змястоўных і якасных. Прычым бібліяграфічныя веды ідэнтыфікуюць не толькі канкрэтны зафіксаваны на пэўным носьбіце аб'ект (яго частку ці лагічна аб'яднаную сукупнасць) з сацыяльна значнай інфармацыяй і праз набор характарыстык сведчаць аб яго непаўторнасці, але і ўсе магчымыя формы фіксавання тэксту, яго ўзнаўленні, інтэрпрэтацыі [21].

Гэта ўласцівасць шырока запатрабавана ў межах гістарычнай навукі, асабліва пры правядзенні гістарыяграфічных, крыніцазнаўчых, археаграфічных даследаванняў. Устанаўленне сапраўднасці таго ці іншага тэксту, ідэнтыфікацыя і аналіз яго асноўных складаючых здзяйсняюцца з дапамогай наяўных бібліяграфічных характарыстык. Бібліяграфічныя веды адносяцца да фактуальных ведаў – «ведаў аб асобных аб'ектыўных фактах, г. зн. асобна ўзятых прадметах (з'явах, уласцівасцях, сувязях), якія паддаюцца непасрэднаму назіранню і адносна поўнаму апісанню» [22], ім уласціва «лакалізацыя, дакладная прывязка да месца і часу устойлівасць, захаванасць у часе… індывідуальнасць… лагічнасць; наяўнасць унутранай арганізацыі… дастаткова развітыя ўнутраныя сувязі…» [23]. У іх аснове ляжаць найчасцей сапраўдныя і надзейныя бібліяграфічныя факты – дакладна ўстаноўленыя фармальныя прыметы тэксту: аўтарства, назва, месца і дата выдання і

да т. п. Трэба заўважыць, што часам іх фармулёўка можа быць даволі складанай і патрабуе ад бібліёграфа прыняцця пэўных рашэнняў, напрыклад, па вызначэнні элементаў запісу, устанаўленні дадатковых ідэнтыфікацыйных характарыстык і, адпаведна, разам з канстатацыяй бібліяграфічнага факта існавання тэксту прысутнічае і інтэрпрэтацыя яго ідэнтыфікацыйных характарыстык.

Больш глыбокі аналіз тэксту (змест і каштоўнасць тэксту) звязаны не з канстатацыяй пэўнага факта (існавання тэксту), а з яго інтэрпрэтацыяй. Узрастае доля суб'ектыўнага на апісальна-ідэнтыфікацыйным узроўні бібліяграфічных ведаў. Пераадоленню гэтага спрыяюць прыняцце стандартаў і фарматаў па бібліяграфічным апісанні і сэнсавай апрацоўцы дакументаў, фарматаў стварэння бібліяграфічных і аўтарытэтных запісаў, прымяненне адзіных класіфікацыйных схем, а таксама выпрацоўка метадычных рашэнняў (банкаў даных метадычных рашэнняў) і імкненне да ўніфікацыі на міжнародным узроўні фармальнай і сэнсавай апрацоўкі дакументаў. Трэба адзначыць, што бібліяграфічным ведам на ўзроўні, які аналізуецца, нягледзячы на прэваліраванне аб'ектыўнай даставернасці над суб'ектыўнай інтэрпрэтацыяй, з цягам часу ўласцівы змены. Ступень надзейнасці некаторых бібліяграфічных фактаў на падставе дадатковага аналізу, прымянення новых метадаў і сродкаў даследавання можа павялічвацца ці памяншацца. Напрыклад, могуць удакладняцца звесткі аб асобах, якія мелі дачыненне да падрыхтоўкі дакумента, яго назва, часам месца і дата напісання і выдання тэксту. З прымяненнем новых інфармацыйна-пошукавых моў ці развіццём раней выкарыстаных змяняецца пошукавы вобраз дакумента, больш дакладна ці іншымі сродкамі алюстроўваецца яго змест і мэтавае прызначэнне. У выпадках, калі бібліяграма зроблена памылкова ці за ёй «нічога ў рэчаіснасці няма», мэтазгодна гаварыць аб ілжывых, несапраўдных бібліяграфічных фактах (квазіфактах, псеўдафактах, артэфактах) [24]. Іх выяўленне патрабуе значных даследчыцкіх намаганняў, а выпрацоўка дакладных бібліяграфічных ведаў мае значную гістарычную складаючую. Яна можа як здзяйсняцца ў межах бібліяграфіі, так і з'яўляцца адным з вынікаў гістарыяграфічных, крыніцазнаўчых, археаграфічных і іншых гістарычных даследаванняў.

Класіфікацыйны ўзровень бібліяграфічных ведаў прадугледжвае мадэляванне сукупнасці (масіваў) бібліяграм і ўпарадкаванне такім чынам звестак аб свеце тэкстаў ва ўсёй яго разнастайнасці, складаных ўнутранай будове і сувязях са знешнім асяроддзем. Мадэляванне любога аб'екта з'яўляецца сродкам яго пазнання. Яно дазваляе адлюстраваць «дакладныя якасныя і колькасныя ўзаемасувязі аб'ектыўнай рэчаіснасці» [25]. Бібліяграфічнае мадэляванне выступае як сродак пазнання свету тэкстаў (дакументаў). Яно забяспечвае структураванне ўсяго назапашанага масіву гістарычных крыніц і даследаванняў і асобных лагічна выдзеленых (запатрабаваных) блокаў. Дазваляе ўстанаўліваць логіка-семантычныя сувязі паміж асобнымі элементамі, актуалізаваць палеагенную інфармацыю і ўводзіць яе ў навуковы абарот. Дае эмпірычны матэрыял для аналізу інфармацыйна-рэсурснай базы гістарычнай навукі, дазваляе прасачыць дынаміку стварэння гістарычных даследаванняў, выяўляць кола навуковых інтарэсаў даследчыкаў, сачыць за праблематыкай распрацовак навуковых, навучальных устаноў і грамадскіх арганізацый. Даследаванне той ці іншай тэмы, праблемы пачынаецца з выкарыстання і/ці стварэння бібліяграфічнай мадэлі адпаведнай часткі масіваў тэкстаў гістарычных крыніц і ўжо зробленых гісторыкамі даследаванняў і заканчваецца бібліяграфічным мадэляваннем выкарыстаных вучоным матэрыялаў.

На аснове мадэлявання масіваў дакументаў будуюцца таксама і гісторыка-бібліяграфічныя навуковыя працы, якія дазваляюць «вывучаць з'явы, недаступныя ў часе (праводзіць рэтраспектыўныя даследаванні) і ў прасторы (незалежна ад геаграфічнага размяшчэння аб'ектаў, якія вывучаюцца)… з'явы і аб'екты, "закрытыя" ці цяжкадаступныя для даследчыка па палітычных, этычных, эканамічных і іншых прычынах… робяць магчымым адначасовы аналіз вялікай колькасці дакументаў, прадстаўленых у згорнутым выглядзе. Гэта дазваляе праводзіць такія даследаванні і атрымліваць такія вынікі, якія не магчымы пры звяртанні даследчыкаў да абмежаванай па якіх-небудзь прычынах колькасці тэкстаў…» [26].

Неабходна адзначыць, што бібліяграфічныя мадэлі вызначаюцца як разнастайнасцю адлюстравання фрагментаў рэчаіснасці, так і рознай структурай: ад самай простай, аднамернай упарадка-

ванасці да складанейшай іерархізацыі элементаў. Гэта базы даных, картатэкі, паказальнікі, спісы і да т. п., якія, як правіла, фарміруюцца ў межах таго ці іншага сацыяльнага інстытута сістэмы тэкставых камунікацый – бібліятэках, архівах, цэнтрах (органах) навуковай інфармацыі. Для гістарычнай бібліяграфіі характэрны актыўны ўдзел у стварэнні ўзроўню бібліяграфічных ведаў, што разглядаецца, навуковых і навучальных устаноў гістарычнага профілю. У фарміраванні класіфікацыйнага ўзроўню бібліяграфічных ведаў удзельнічаюць таксама і навукоўцы падчас падбору гістарычных крыніц і даследаванняў па тэме, якая распрацоўваецца, стварэння метадычнага апарату выдання. Мінімальнай адзінкай любой бібліяграфічнай мадэлі з'яўляецца бібліяграфічны запіс (асобная бібліяграма), што ідэнтыфікуе асобны тэкст (часам сукупнасць тэкстаў ці яго частку) і становіцца аб'ектам пазнання, суаднясення па зададзеных фармальных, змястоўных, каштоўнасных параметрах з іншымі элементамі. Паміж пэўным наборам бібліяграм устанаўліваюцца фармальныя, змястоўныя, лагічныя сувязі і такім чынам ствараецца арыгінальны навуковы, навукова-папулярны ці прафесійна-дапаможны бібліяграфічны твор (рэсурс). Яго аснову складаюць бібліяграфічныя веды аб асобных тэкстах і бібліяграфічныя веды аб сукупнасці тэкстаў.

Разам з тым бібліяграфічнае мадэляванне можа здзяйсняцца і ў межах аднаго, асобна ўзятага тэксту (дакумента). Прычым ствараюцца могуць розныя мадэлі. Як вядома, у тэксце могуць прысутнічаць прытэкставыя бібліяграфічныя матэрыялы, а таксама разнастайныя дапаможныя паказальнікі. Яны ствараюцца для розных мэт, у аснове іх ляжаць розныя прынцыпы арганізацыі і, адпаведна, яны па-рознаму мадэлююць інфармацыю. Прытэкставыя бібліяграфічныя матэрыялы прадстаўлены ўнутры самога першаснага тэксту, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам. Гэта мадэль запатрабаванай аўтарам часткі ўніверсуму зафіксаваных ведаў, ведаў аб дакументах, сугучных па праблематыцы яго твору. Ён мадэлюе «зыходзячы са зместу і жанру сваёй працы магчымыя аптымальныя варыянты чытання… і ў адпаведнасці з іх дыяпазонам пранізвае тэкст [адпаведнымі] алгарытмамі… прадугледжвае чляненне інфармацыі... і аб'ём метаінфармацыйных элементаў, што рэзюмуюць і анансуюць характар кожнага раздзела…

прадугледжвае розныя ўваходы ў тэкст і выхады за яго межы, да яго вытокаў, да яго інфармацыйнай прасторы праз латэнтную бібліяграфічную інфармацыю» [27]. Аўтар карыстаецца шэрагам крыніц, спасылаецца на іх, дае крытычны аналіз і праз бібліяграфічныя спасылкі вызначае месца свайго твора ў сістэме гістарычных ведаў. Фармальны аналіз сукупнасці такіх бібліяграфічных запісаў (паток дакументаў, што цытуюцца) дазваляе ствараць «карты навукі» і прасочваць яе развіццё за вялікі адрэзак часу.

Гістарычная праца можа суправаджацца своеасаблівымі даведнікамі па тэксце, так званымі дапаможнымі паказальнікамі, – пералікам назваў або абазначэнняў любых інфармацыйных аб’ектаў, якія сустракаюцца ў тэксце. Па сутнасці ў такіх выпадках здзяйсняецца аперыраванне асобнымі кампанентамі тэксту, ствараюцца мадэлі тэматычнай, аўтарскай і іншых структур тэксту (дакумента). Яны здольны шматаспектна раскрываць змест тэксту, ілюстраваць паняційны апарат і тэрміналагічныя асаблівасці і ў пэўнай ступені характарызаваць прыналежнасць аўтара да пэўнай навуковай плыні ці гістарычнай школы. Такія мадэлі спрыяюць хуткаму пошуку фрагментаў тэксту і робяць (пры неабходнасці) магчымым адмаўленне ад яго суцэльнага прагляду. Такім чынам, бібліяграфічныя веды, што ствараюцца, адносяцца да наступнага ўзроўню – аб’ектнага. Бібліяграфічнымі сродкамі фарміруюцца веды аб асобных аб’ектах, пра якія ідзе размова ў самім тэксце, і мадэлююцца масівы гістарычных тэкстаў паводле такога аб’екта. Гэта больш выразна бачна пры аналізе аўтарытэтных/нарматыўных запісаў – неад’емнай складаючай сучасных інфармацыйна-пошукавых сістэм. Іх прымяненне дазваляе адназначна ідэнтыфікаваць найменне аб’екта і выдзяляць яго сярод іншых з такім ці падобным імем, звязваць паміж сабой яго розныя імёны і розныя аб’екты (напрыклад, з асобай – прастаўнікам роду і родавым кланам). Прычым робіцца гэта хутчэй і шырэй, чым праз даведачныя выданні [28]. Механізм аўтарытэтных запісаў дазваляе на падставе тэкстаў устанаўліваць не толькі дакладныя назвы аб’ектаў і выяўляць любыя варыянты іх абазначэння, але і спалучаць у адзін сэнсавы блок тэксты незалежна ад іх зместу, мовы, формы, месца, даты стварэння, захавання і да т. п. У сучаснай бібліятэчнай практыцы так званы аўтарытэтны кантроль

здзяйсняецца адносна асоб (персаналій у тым ліку), родавых імёнаў, геаграфічных назваў, назваў установ (калектываў), уніфікаваных назваў тэкстаў і інш. Гэта вельмі добрая магчымасць спалучыць інфармацыю аб адным і тым жа аб'екце з крыніц рознага тэматычнага кірунку (магчыма, з розных галін ведаў) і стварыць адпаведна бібліяграфічныя веды аб аб'екце. Такая ўласцівасць рэалізуецца найчасцей у электронных каталогах і іншых інфармацыйных сістэмах універсальнага характару, але найбольш глыбока змест гістарычных крыніц і гістарычных даследаванняў можна адлюстраваць праз галіновыя і краязнаўчыя базы даных, а таксама праз стварэнне аб'яднанага блока аўтарытэтных/нарматыўных запісаў для адлюстравання бібліятэчных, архіўных і музейных дакументаў. Пры гэтым паказваюцца міжгаліновыя сувязі аб'ектаў гістарычнага даследавання, аб'ядноўваецца ў асобны блок паводле пэўнага аб'екта інфармацыя з розных гістарычных крыніц незалежна ад месца іх захавання, уласнай матэрыяльнай канструкцыі, а таксама спалучаюцца гістарычныя веды, зафіксаваныя ў даследаваннях. Для гісторыка такім чынам фарміруецца неабходная яму сукупнасць фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі, а калі ў пошукавай сістэме рэалізаваны транзітныя ўласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі, то магчымы імгненны доступ і да саміх тэкстаў.

На жаль, вышэйразгледжаныя магчымасці прадстаўлення бібліяграфічных ведаў пакуль што не вельмі асэнсаваны гістарычнай навуковай супольнасцю. Гэта тлумачыцца як ступенню дасведчанасці саміх даследчыкаў гісторыі, так і станам бібліяграфічных пошукавых сістэм, што прапануюцца (іх напаўненнем, якасцю сэрвісаў і да т. п.). Да таго ж з укараненнем камп'ютарных тэхналогій і адпаведна паскарэннем камунікатыўных працэсаў, з'яўленнем магчымасці камбінавання розных відаў інфармацыі і хуткага доступу да першаснага тэксту значнасць бібліяграфічнай прадукцыі стала некалькі прыніжацца. Нават на выключна бібліяграфічныя з'явы стаў распаўсюджвацца тэрмін «метаінфармацыя». Тым не менш значнасць бібліяграфічных ведаў і патрабаванні да іх не зніжаюцца.

У межах беларускай гістарычнай бібліяграфіі ствараюцца ўсе вышэйразгледжаныя ўзроўні бібліяграфічных ведаў. Але трэба адзначыць, што ў апошняе дзесяцігоддзе яна не вельмі істотна

прасунулася на шляху стварэння фундаментальнай бібліяграфічнай прадукцыі. Агульнагаліновыя паказальнікі і база даных па гісторыі Беларусі толькі фрагментарна адлюстроўваюць назапашаныя стагоддзямі пласты тэкстаў, створаных і запатрабаваных айчыннай гістарычнай навукай. Лакуны ведаў гістарычнай бібліяграфіі адмоўна ўплываюць на механізмы працы гісторыка па пошуку і мадэляванню тэкстаў. Адчуваецца недахоп такіх рэсурсаў, як Нацыянальная бібліяграфія Беларусі, Нацыянальная электронная бібліятэка Беларусі.

З пачатку 2000-х гг. Нацыянальная бібліятэка Беларусі стварае Нацыянальную базу аўтарытэтных запісаў, у апошнія гады да гэтай працы далучыліся яшчэ дзве рэспубліканскія бібліятэкі. Зроблена якаснае ядро ведаў аб нацыянальных аб’ектах, адлюстраваных у дакументах з фондаў трох буйнейшых бібліятэк краіны. Неабходна далучэнне да гэтай справы архіваў і музеяў, раскрыццё іх фондаў разам з бібліятэчнымі і такім чынам як спрашчэнне алгарытмаў пошуку інфармацыі, так і паляпшэнне рэсурснай базы гістарычных даследаванняў.

Магчымасці беларускай гістарычнай бібліяграфіі як дзейснага інструмента гістарычнага пазнання нельга недаацэньваць. Яна забяспечвае пазнанне тэксту (дакумента) як фрагмента рэчаіснасці і стварае пры гэтым бібліяграфічныя веды аб канкрэтнай крыніцы і масіве гістарычных крыніц. Аналітыка-сінтэтычны інструментарый гістарычнай бібліяграфіі дазваляе вылучыць у свеце тэкставых камунікацый гістарычныя па змесце тэксты, мадэляваць іх любую сукупнасць, ствараць для гістарычнай навукі бібліяграфічную панараму гістарычных даследаванняў і забяспечваць гісторыку эфектыўны пошук інфармацыі. Сучаснымі сродкамі гістарычнай бібліяграфіі здзяйсняецца мадэляванне масіваў тэкстаў адносна аб’екта, зафіксаванага ў тэксце, устанаўліваюцца яго ідэальныя характарыстыкі і сувязі са знешнім асяроддзем. Беларуская гістарычная бібліяграфія такім чынам спрыяе забеспячэнню камунікацыйных працэсаў паміж аўтарамі гістарычных тэкстаў і іх патэнцыяльнымі карыстальнікамі. Неабходна падкрэсліць, што пакуль у чалавека, стваральніка і карыстальніка інфармацыі, будзе патрэба ў ідэнтыфікацыі сябе як аўтара тэксту, пэўных канцэпцый, ідэй і ўстанаўленні аўтарства пры выкарыстанні інфармацыі, будзе існаваць і развівацца бібліяграфія – тая ідэаль-

ная сістэма, якую вядомыя сучасныя бібліяграфазнаўцы трактуюць як «універсальны сродак ідэнтыфікацыі суверэнных інфааб’ектаў» [29], а таксама веды, што «правамерна разглядаць як правераны бібліяграфічнай практыкай і ўдакладнены логікай вынік спецыфічнага пазнання дакументаваных тэкстаў (іх патокаў і масіваў) і патрэбнасцей у іх, адэкватнае іх адлюстраванне ў свядомасці чалавека ў выглядзе ўяўленняў, кагнітыўных вобразаў» [30]. Найбольш выразна гэта прасочваецца на прыкладзе гістарычнай бібліяграфіі, якая з’яляецца спецыяльнай гістарычнай дысцыплінай і самай складанай галіновай бібліяграфічнай сістэмай.

ЛІТАРАТУРА

1. **Фокеев, В. А.** Природа библиографического знания : монография / В. А. Фокеев ; РГБ, Сектор истории книги, библ. дела и библиогр. – Москва : РГБ, 1995. – С. 12.

2. Там жа. С. 12.

3. **Медушевская, О. М.** Теория и методология когнитивной истории / О. М. Медушевская ; [Рос. гос. гуманитарный ун-т]. – Москва : РГГУ, 2008. – 360, [1] с. ; **Методология** исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 22–23 окт. 2008 г.) / [редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 255, [2] с. ; **Миницкий, Н. И.** Методы построения научного и образовательного исторического знания : монография / Н. И. Миницкий. – Минск : БГПУ, 2006. – 201, [2] с. ; **Проблемы** математической истории: историческая реконструкция, прогнозирование, методология : [сб. докл. участников конф. по мат. ист., окт. 2007 г.] / отв. ред.: Г. Г. Малинецкий, А. В. Коротаев. – Москва : URSS : Либроком, 2009. – 246 с. ; **Шевченко, В. В.** Квантитативная история: поиск методологических ориентиров (к истории проблемы) / В. В. Шевченко // Человек, общество, история: методологические инновации и региональный контекст : материалы работы секций Всерос. науч. конф. памяти С. Э. Крапивенского, г. Волгоград, 16−17 апр. 2008 г. / [редкол.: А. Л. Стризое (отв. ред.) и др.]. – Волгоград : Издательство ВолГУ, 2008. – С. 202–209 ; **Состояние** и развитие методологических исследований в исторической науке Республики Беларусь и Российской Федерации : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, УО «Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы». – Гродно : ГрГУ, 2008. – 297 с.

4. **Питц, Э.** Исторические структуры: (к вопросу о так называемом кризисе методолгических основ исторической науки) / Эрнст Питц // Философия и методология истории : сб. ст. / пер. с англ., нем., фр.

Ю. А. Асеева. – Благовещенск : Благовещенский гуманитарный колледж, 2000. – С. 170.

5. **Шмаков, В. С.** Структура исторического знания и картина мира / В. С. Шмаков ; отв. ред. В. И. Бойко ; АН СССР, Сиб. отд-ние, Ин-т истории, филол. и филос. – Новосибирск : Наука. Сиб. отд-ние, 1990. – С. 30–31.
6. Там жа. С. 31.
7. **Савельева, И. М.** Теория исторического знания : учеб. пособие / И. М. Савельева, А. В. Полетаев. – Санкт-Петербург : Алетейя ; Москва : ГУ ВШЭ, 2008. – С. 244.
8. **Миницкий, Н. И.** Методы построения … С. 43.
9. Там жа. С. 87.
10. Там жа. С. 44–45.
11. **Ковальченко, И. Д.** Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко ; Рос. акад. наук, Отд-ние ист.-филол. наук. – 2-е изд., доп. – Москва : Наука, 2003. – 485, [1] с. ; **Проблемы** математической истории: историческая реконструкция, прогнозирование, методология : [сб. докл. участников конф. по мат. ист., окт. 2007 г.] / отв. ред.: Г. Г. Малинецкий, А. В. Коротаев. – Москва : URSS : Либроном, 2009. – 246 с. ; **Шевченко, В. В.** Квантитативная история … С. 202–209.
12. **Проблемы** методологии исследований истории Беларуси : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 26–27 окт. 2006 г.) / [редкол.: А. А. Коваленя (отв. ред.) и др.]. – Минск : Белорусская наука, 2008. – С. 25.
13. **Шевченко, В. В.** Квантитативная история … С. 207.
14. **Шмаков, В. С.** Структура исторического знания … С. 18.
15. **Сидорцов, В. Н.** Современные методологические измерения истории / В. Н. Сидорцов // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 26–27 окт. 2006 г.) / [редкол.: А. А. Коваленя (отв. ред.) и др.]. – Минск : Белорусская наука, 2008. – С. 92.
16. Там жа. С. 92.
17. **Табачков, А. С.** История как метатеория прошлого : монография / А. С. Табачков. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2008. – С. 79.
18. **Фокеев, В. А.** Природа библиографического знания … С. 38.
19. **Гордукалова, Г. Ф.** Документальный поток в библиографической деятельности: история, теория, технология освоения: дис. … доктора пед. наук : 05.25.03 / Г. Ф. Гордукалова ; СПбГИК. – Санкт-Петербург, 1992. – 506 с.
20. **Миницкий, Н. И.** Методы построения научного и образовательного исторического знания : монография / Н. И. Миницкий. – Минск : БГПУ, 2006. – 201, [2] с. ; **Розин, В. М.** Семиотические исследования /

Вадим Розин. – Москва : ПЕР СЭ ; Санкт-Петербург : Унив. кн., 2001. – 251, [1] с.

21. **Функциональные** требования к библиографическим записям : окончательный отчет : пер. с англ. / Рос. библ. ассоц., Рос. гос. б-ка ; [науч. ред.: Т. А. Бахтурина, Н. Н. Каспарова, Н. Ю. Кулыгина]. – Москва : Пашков дом, 2008. – С. 25.

22. **Фокеев, В. А.** Природа библиографического знания … С. 226.

23. Там жа. С. 231.

24. Там жа. С. 241.

25. **Ходаковский, Н. И.** Моделирование информационных процесс-сов социальной памяти общества (Архивоведческие аспекты) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 05.25.02 / Рос. гос. гуманитар. ун-т, Ист.-арх. ин-т. – Москва, 1993. – С. 17.

26. **Зусьман, О. М.** Научные исследования как часть библиографической деятельности / О. М. Зусьман // Мир библиографии. – 1998. – С. 12–13.

27. **Сляднева, Н. А.** Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа / Н. А. Сляднева. – Москва : Издательство МГИК, 1993. – С. 176.

28. **Ильина, С. В.** Авторитетные/нормативные базы данных в АБИС : учеб. пособие / С. В. Ильина ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКиИ, 2012. – С. 15.

29. **Сляднева, Н. А.** Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа / Н. А. Сляднева. – Москва : Издательство МГИК, 1993. – 227 с.

30. **Фокеев, В. А.** Природа библиографического знания … С. 11.

*Показаны знаниевая сущность исторической библиографии как специальной исторической дисциплины и отраслевой библиографической системы, потенциал белорусской исторической библиографии в историческом познании. Рассмотрены основные уровни исторических библиографических знаний, возможности моделирования информации современными средствами белорусской исторической библиографии.*

*The article reveals the knowledge nature of historical bibliography as the particular historic field of study and branch bibliographic system. It shows the potential of the Belarusian historical bibliography in historic cognition. Considered are the basic levels of historic bibliographic accomplishments as well as the possibilities of information modeling by modern means of Belarusian historical bibliography.*